Волкава  Яўгенія

Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі

# Некаторыя аспекты ўпарадкавання шматмоўнай картатэкі ключавых слоў нетэрміналагічнага характару ў бібліяграфічнай базе iSybislaw і аптымізацыі яе выкарыстання

У шматмоўнай картатэцы iSybislaw значную частку складаюць ключавыя словы нетэрміналагічнага характару: імёны асоб, назвы разнастайных навуковых інстытуцый, тытулы навуковых і мастацкіх твораў, асобныя лексемы, паняцці, марфемы і інш. Паколькі іх колькасць увесь час расце, паўстае пытанне ўпарадкавання і сістэматызацыі дзеля дасягнення рэлевантнасці і паўнаты вынікаў пошуку. Асабліва гэта датычыць наступных груп ключавых слоў: паняцці, марфемы, назвы рэаліяў. Для больш поўнага пошуку align рознамоўных дакументаў паводле назвы паняцця або назвы рэаліі ўзнікае неабходнасць аб'яднання рознамоўных назваў у клас эквівалентаў. Падобны клас эквівалентаў можа быць створаны і для марфем аднаго паходжання, асабліва што датычыць блізкароднасных моў.